# АФАНАСІЙ ФЁДАРАВІЧ КАВАЛЁЎ

20 ліпеня 1993 года памёр Афанасій Фёдаравіч Кавалёў, былы Старшыня Саўнаркома БССР.

Афанасій Фёдаравіч нарадзіўся 2(15) снежня 1903 года ў вёсцы Лошыца Барысаўскага раёна Мінскай вобласці ў сям'і селяніна. Закончыў Віцебскі кааператыўны тэхнікум і Вышэйшыя педагагічныя курсы ў г. Ленінградзе. З 1924 года працаваў старшынёй сельскага Савета, а затым знаходзіўся на кааператыўнай рабоце ў Барысаўскім раёне. З 1932 года займаўся педагагічнай дзейнасцю ў Віцебску. З 1934 года працаваў у партыйных органах. З 1937 па 1939 гады — Старшыня СНК БССР, старшыня арганізацыйнага камітэта Вярхоўнага Савета па адукацыі Мінскай вобласці. Выбіраўся дэпутатам Вярхоўнага Савета СССР і Вярхоўнага Савета БССР першых скліканняў. У 1939 годзе па паклёпніцкіх матэрыялах быў арыштаваны органамі НКУС і пасля працяглага следства рэабілітаваны і вызвалены.

Да выхаду на пенсію ў 1960 годзе працаваў намеснікам старшыні праўлення Белкаапсаюза. На ўсіх участках работы Афанасій Фёдаравіч праявіў сябе самаадданым працаўніком, быў уважлівым і чулым чалавекам, карыстаўся аўтарытэтам і павагай ва ўсіх, з кім яму даводзілася працаваць і сустракацца.

Пайшоў ад нас Афанасій Фёдаравіч, але ён назаўсёды застанецца ў нашай памяці, у памяці сваёй зямлі, якую ён любіў горача і шчыра.